# ГІСТОРЫЯ

УДК 94(476)

***Аляксандр Мікалаевіч Вабішчэвіч***
*д-р гіст. навук, праф., заг. каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Alyaksandr Vabishchevich***
*Doctor of Historical Sciences, Professor, Head of the Department of History of Slavic Peoples*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: vabischev@rambler.ru

## САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ ВЁСКІ РУБЕЛЬ НА СТОЛІНШЧЫНЕ (1945 г. – ПАЧАТАК XXI ст.): ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ

*Адлюстравана пасляваеннае аднаўленне в. Рубель Столінскага раёна Брэсцкай вобласці, што была спалена германскімі нацыстамі ў маі – чэрвені 1944 г., прааналізавана гісторыя калгаса (з моманту яго ўтварэння ў 1948 г. да сучаснасці), раскрыты дасягненні і цяжкасці ў сацыяльна-эканамічным развіцці вёскі ва ўмовах яе перанаселенасці, выяўлены тэндэнцыі ў штодзённым жыцці жыхароў (сезонны адток працоўнай сілы, пераезд на пастаяннае жыхарства ў іншыя рэгіёны, развіццё прысядзібных гаспадарак пасля правядзення зямельнай рэформы ў пачатку 1990-х гг., іх уключэнне ў рынкавыя адносіны). У навуковы ўжытак упершыню ўведзены дакументальныя матэрыялы з фондаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці і Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Пінску.*

## Socio-Economic Development of the Village of Rubel, Stolin District (1945 – the Beginning of the XXI Century): Local History Research

*The article is devoted to the history of the village of Rubel, Stolin district, Brest region of Belarus from the end of World War II to the beginning of the 21st century. It is shown how this village, which was completely burned down by the German Nazi occupiers in 1944, was revived in the post-war decades and turned into one of the largest rural settlements in the republic. The social and economic state of the local collective farm is reflected. The main trends in the daily life of the villagers are identified.*

### Уводзіны

Артыкул прысвечаны гісторыі аднаго з самых буйных сельскіх населеных пунктаў Беларусі – вёскі Рубель Давыд-Гарадоцкага (з 1961 г. – Столінскага) раёна Пінскай (з 1954 г. – Брэсцкай) вобласці і з'яўляецца працягам папярэдніх публікацый аўтара, у якіх даследавалася рэлігійнае жыццё мясцовага насельніцтва [1; 2]. У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе самаадданай працай жыхароў вёска была адроджана і разбудавана, стала цэнтрам калгаса «Сцяг камунізму». У 1959 г. у вёсцы пражывала 4 668 чалавек, у 1970 г. – 5 565 чалавек, у 1979 г. – 5 403 чалавекі [3, с. 124].

Вывучэнне гісторыі раёнаў, гарадоў, сельскіх паселішчаў з'яўляецца запатрабаваным напрамкам у гістарычнай навуцы. Краязнаўства Беларусі і яе асобных рэгіёнаў на працягу шматлікіх дзесяцігоддзяў назапасіла ўжо сур'ёзны багаж ведаў.

Гісторыя Століншчыны выкладзена ў абагульняльнай гісторыка-дакументальнай хроніцы «Памяць» [4], у шматлікіх публікацыях гісторыкаў, краязнаўцаў, этнолагаў, фалькларыстаў М. Баліцкага, М. Бразоўскага, В. Вабішчэвіча, Г. Вячоркі, С. Жлобы, В. Ліцвінкі, І. Ляшкевіча, М. Карсекі, М. Пратасавіцкага, Л. Раманенкі, У. Сенькаўца, П. Украінец, М. Шэлехава і інш. Мовазнаўчымі даследаваннямі в. Рубель займаецца М. Пашкевіч, але асобных прац па гісторыі вёскі пакуль няма.

Мэтай артыкула з'яўляецца даследаванне сацыяльна-эканамічнага развіцця в. Рубель ад сканчэння Другой сусветнай вайны да пачатку XXI ст.

Для дасягнення пастаўленай мэты вызначаны задачы:

1) увесці ў навуковы ўжытак новыя крыніцы, выяўленыя ў фондах Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Пінску;

2) прааналізаваць сацыяльна-эканамічнае становішча вёскі ў 1945–1947 гг., станаўленне, развіццё мясцовага калгаса ў 1948–1991 гг., яго дасягненні і праблемы, колькасныя і якасныя паказчыкі сельскагаспа-

дарчай вытворчасці, эвалюцыю калектыўнай гаспадаркі на сучасным этапе (1991–2020 гг.);

3) адлюстраваць паўсядзённае жыццё жыхароў вёскі, іх занятасць, ступень вырашэння сацыяльных праблем.

**Пасляваеннае аднаўленне. Дзейнасць калгаса ў 1948 – 1950-я гг.**

У маі – чэрвені 1944 г. германскія нацысцкія акупанты абрабавалі і поўнасцю спалілі в. Рубель (730 дамоў), засталася толькі Свята-Міхайлаўская царква. Пасля вызвалення ад акупантаў у ліпені таго ж года вяскоўцы вымушаны былі жыць у лесе, у зямлянках і шалашах («станка́х»). Складанай была санітарна-эпідэміялагічная сітуацыя: хваробы, холад і голад вялі да гібелі многіх уцалелых жыхароў.

Савецкай дзяржавай было адпушчана 28 тыс. $м^3$ лесу, выдзелена больш за 1 млн руб. доўгатэрміновых крэдытаў, каля 1 млн руб. на набыццё хатняй жывёлы. Аднак востра адчуваўся недахоп мужчын, якія пайшлі на фронт і многія з якіх не вярнуліся. Не хапала цяглавай сілы, матэрыяльных сродкаў. Па стане на 29 жніўня 1945 г. у Рубельскім сельсавеце было пабудавана 345 дамоў (у в. Рубель – 274, у суседняй Хотамель – 19), 108 зрубаў (адпаведна 89 і 19) [5, арк. 154]. У сакавіку 1947 г. у Рубельскім сельсавеце самакрытычна прызнавалі, што пакуль мала звярталі ўвагі на дапамогу ў пабудове дамоў сем’ям, якія яшчэ жылі ў зямлянках [6, арк. 15]. Партыйныя ўлады намагаліся пабудаваць дамы і перасяліць людзей з зямлянак да 7 лістапада. Аднак і пазней многія жыхары працягвалі жыць у зямлянках ці па некалькі сем’яў у адной хаце.

На агульным сходзе сялян в. Рубель яшчэ 10 чэрвеня 1945 г. было ўзнята пытанне аб пабудове школы. Мікалай Рыгоравіч Хромчанка, прызначаны загадчыкам Рубельскай пачатковай школы, заклікаў агульнымі намаганнямі пабудаваць школу і прыступіць да гэтага «з наступнага дня» [7, арк. 23]. З 1946/47 навучальнага года загадчыкам Рубельскай пачатковай школы стала Марыя Іванаўна Старасценка. Яна *«начала приступать к оборудованию 3-х зданий под школы и добывать скамейки для учеников… В связи со свирепствием брюшного тифа занятия в школе затянулись… Первые занятия начались с учениками 20 декабря 1946 г.»* [6, арк. 21адв., 23]. У 1946/47 навучальным годзе школу наведвалі 560 дзяцей, у наступным 1947/48 – больш за 600. Тады не хапала настаўнікаў, падручнікаў, вучэбнага інвентару і інш. Замест сшыткаў і паперы пісалі на газетах і вуглём.

Былі распаўсюджаны інфекцыйныя захворванні – брушны тыф, адзёр, сухоты, шкарлятына, дыфтэрыя і інш. Масавага голаду ў пасляваенныя гады ўдалося пазбегнуць. Нярэдка з усходу прыходзілі галодныя людзі, якія прасілі ў сялян-аднаасобнікаў працы, каб атрымаць прадукты і іншыя неабходныя рэчы, ці мянялі рэчы на хлеб, набывалі зерне. За пуд зерня цана дасягала 600 руб. [8, арк. 21адв.].

Сяляне-аднаасобнікі былі абкладзены living рознымі дзяржаўнымі падаткамі, прыцягваліся да лесанарыхтовак, дарожнага будаўніцтва і інш. Па загатоўках здавалі мяса, малако, воўну і інш. Ухіліцца ад выканання было нельга, бо гэта расцэньвалася як сабатаж савецкай улады, а значыць, пагражала рэпрэсіямі.

Аб’ёмы лесанарыхтовак пастаянна павялічваліся дырэктыўнымі патрабаваннямі зверху. На лесанарыхтоўках сяляне выкарыстоўвалі ўласных коней, усе працы праводзіліся ўручную піламі, сякерамі. Пры гэтым сяляне разумелі неабходнасць гэтай амаль бясплатнай працы на карысць савецкай дзяржавы. У канцы вайны і ў пасляваеннныя гады драўніна была востра запатрабаванай для аднаўлення разбуранага.

20 сакавіка 1948 г. у в. Рубель быў створаны калгас з ідэалагізаванай назвай «Сцяг камунізму» (толькі ў 1992 г. яна была зменена на «Рубельскі»). Першым старшынёй калгаса ў 1948–1950 гг. быў мясцовы ўраджэнец, у час вайны – партызанскі сувязны, беспартыйны актывіст беларус Андрэй Паўлавіч Разановіч. Ён нарадзіўся ў 1904 г., меў 3 класы адукацыі.

У сялян заставалася моцнай прыватнаўласніцкая псіхалогія. На адным з пасяджэнняў бюро райкама партыі ў пачатку 1949 г. адзначалася, што «*в колхозе имеются случаи захвата земли крестьянами-единоличниками, крайне неудовлетворительно поставлена трудовая дисциплина*» [9, арк. 150]. Вясной 1950 г. было раздадзена аднаасобным гаспадаркам 154 га калгаснага сенакосу. На пасяджэнні бюро райкама адзначалася: *«Единоличные крестьянские хозяйства в Рубельском сельсовете пользовались пахотной*

*землей в колхозном массиве… прилив единоличных крестьянских хозяйств в колхозы по сельсовету за последнее время совершенно прекратился… выход на работу колхозников составляет 15–50 % в день»* [10, арк. 100].

На адным з партыйных сходаў у жніўні 1950 г. старшыні калгаса ўказалі на тое, што *«единоличники между сложенными в бабки снопами собирали колосья»* [11, арк. 49]. У калгасе тады назіраліся факты крадзяжу: *«Семенную рожь воруют… Овсяная солома и мякина гниют, а у колхозников нет корма для своего скота… Возы изломаны и не ремонтируются. Инвентарь до сих пор... не обобществлен… воруют колхозную рожь, а также сено, бульбу»* [11, арк. 65].

У межах узбуйнення калгасаў адбылося аб'яднанне ў адну калектыўную гаспадарку рубельскага і суседняга хотамельскага імя М. Шверніка (існаваў з 19 жніўня 1949 г. пад кіраўніцтвам мясцовага актывіста Фёдара Піліпавіча Мазаля) калгасаў – у калгас «Сцяг камунізму». Статут новага калгаса быў прыняты на агульным сходзе 17 кастрычніка 1950 г. [12, арк. 1]. Старшынёй аб'яднанага калгаса стаў «ўсходнік» Пётр Акімавіч Паўлікаў (1897 г. н., рускі, камуніст з 1928 г., меў 7 класаў адукацыі).

Завяршэнне калектывізацыі ішло павольна. Як адзначалася на партсходзе 23 сакавіка 1951 г., на тэрыторыі Рубельскага сельсавета налічвалася яшчэ 240 аднаасобных гаспадарак, што прызнавалася «тормазам» у правядзенні калектывізацыі [12, арк. 18]. У красавіку 1951 г. у калгас уступіла толькі 30 сялянскіх гаспадарак.

Аб выніках працы калгаса «Сцяг камунізму» ў першыя гады існавання сведчыць справаздача з арганізаванага на яго базе 5–6 чэрвеня 1951 г. раённага лекторыя для старшынь калгасаў. У 1950 г. у калгасе з 333 га было атрымана збожжавых па 16,8 ц з гектара, азімага жыта – больш за 21 ц з гектара, бульбы – 80 ц з гектара. Быў перавыкананы дзяржаўны план па жывёлагадоўлі. На фермах налічвалася 618 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 115 дойных кароў, 403 авечкі, 123 свінні, 105 гусей, 112 курэй. Гадавы прыбытак калгаса складаў 253 тыс. руб. [13, с. 2]. У 1951 г. у калгасе налічвалася 824 сялянскія гаспадаркі, 842 га ворыўнай зямлі, 3 558 га сенажацяў, 964 га пашы, 444 га было занята лесам. Адбываўся пераход да развіцця высокапрадуктыўнай жывёлы. У калгасе было пабудавана 6 тыпавых жывёлагадоўчых памяшканняў, разгорнута будаўніцтва іншых жывёлагадоўчых пабудоў: канюшняў, кароўнікаў, свінарнікаў, цялятнікаў, птушкафермаў і аўчарняў. Узводзіліся таксама калгасная кантора, пажарнае дэпо, майстэрні, сушылкі. Акрамя драўляных, будавалі цагляныя памяшканні, а таксама ўзводзілі глінаплятнёвыя, выкарыстоўвалі танны матэрыял – саман.

Развіццё калгаснай мяса-малочнай жывёлагадоўлі было прадвызначана наяўнасцю спрадвеку багатых на корм гарынскіх пойменных лугоў. У калгасе стваралася племянная ферма для кароў, якая выдзялялася высокімі надоямі малака з высокай тлустасцю (4–6 %). У 1949–1950 гг. беларускімі вучонымі былі праведзены ў Столінскім і Давыд-Гарадоцкім раёнах абследаванні сіментальскай пароды гарынскай буйной рагатай жывёлы, якая была вельмі прадуктыўнай, вызначалася добрымі малочнымі і мяснымі якасцямі. Лепшая жывёла была выяўлена ў Рубельскім, Веляміцкім, Беражноўскім, Белавушскім і Манькавіцкім сельсаветах, з яе амаль палова была сканцэнтравана на правабярэжжы р. Гарынь з цэнтрамі ў вёсках Рубель і Хотамель. Каровы важылі больш за 450 кг, давалі летам да 16 л тлустага малака. Амаль паўгода яны ўтрымліваліся на пашы, без дадатковых кармоў, былі ўстойлівымі да хваробаў. Менавіта калгас «Сцяг камунізму» стаў апорным пунктам па рабоце з гарынскай жывёлай. Яе вывучэнне, арганізацыя племянной і заатэхнічнай працы сталі з лістапада 1951 г. клопатам спецыялістаў Беларускага навукова-даследчага інстытута жывёлагадоўлі.

Другі іх пункт быў адкрыты ў 1954 г. у калгасе імя Леніна Беражноўскага сельсавета. Лепшая частка гарынскай жывёлы была прадстаўлена буйнымі каровамі пераважна малочна-мясного тыпу. Па жывой вазе, малочнай прадуктыўнасці, тлушчамалочнасці, моцнай канстытуцыі і прыстасаванасці да мясцовых кармоў, кліматычных умоў гарынская жывёла з'яўлялася эканамічна мэтазгоднай для калгасаў усяго беларускага Палесся [15, с. 3–4; 16, с. 3].

Вучоныя названага інстытута праводзілі таксама доследы па вырошчванні на карбанатных суглінках эспарцэту – каштоўнай кармавой культуры з сямейства бабо-

вых, добрага меданоса (эспарцэт выкарыстоўваўся таксама як угнаенне).

На калгаснай свінаферме была заведзена буйная белая парода свіней. Хутка на птушкаферме гадавалі курэй пароды легорн. Акрамя жывёлаводаў (38 чалавек), у рубельскім калгасе было тады 11 паляводчых брыгад – па 100–150 працаздольных калгаснікаў у кожнай з іх, будаўнічая брыгада і брыгада па накапленні кармоў. Займаліся і працаёмкім ільнаводствам. Пераважала ручная праца калгаснікаў. У час жніва жанчыны сярпамі зжыналі па 12–15 сотак збажыны [17, с. 2].

У пачатку 1950-х гг. у калгасе вырошчвалі кок-сагыз. Атрыманая з яго сыравіна (каўчуканос), так патрэбная для аўтамабільнай прамысловасці, была маларэнтабельнай, вельмі працаёмкай – фактычна грунтавалася на дармовай працы калгаснікаў за працадні. У 1951 г. была створана каўчукаводная брыгада з 5 звенняў. За здадзенае насенне і карэнне кок-сагызу калгас атрымаў больш за 100 тыс. руб. прыбытку. У 1952 г. было створана ўжо 7 звенняў каўчукаводаў (100 калгасніц) [18, с. 1; 19, с. 2].

Гарачы прыхільнік калгаснага ладу, старшыня П. Паўлікаў у лісце на імя першага сакратара Пінскага абкама Р. Мачульскага восенню 1951 г. патрабаваў узмацнення падатковага ўціску на сялян-аднаасобнікаў. Пры разборы гэтага ліста ў Давыд-Гарадоцкім райкаме партыі адзначалася, што раённыя фінансавыя і нарыхтоўчыя органы зрабілі «паслабленне» ў падатковай палітыцы. Было заяўлена, што ў Рубельскім і іншых сельсаветах *«более 50 % единоличных крестьянских хозяйств оказались не обложены, их доходы от земли и неземледельческие не учтены… коллективизация бедняцко-середняцких хозяйств в районе до сего времени не завершена»*. Безумоўна, было прынята рашэнне аб чарговым наступе на сялян-аднаасобнікаў: *«Пересмотреть каждое единоличное хозяйство, выделить дополнительные источники дохода и в зависимости от этих источников произвести дополнительное обложение»* [14, арк. 102–103].

Рубельскі калгас стаў перадавой гаспадаркай, неаднаразова быў пераможцам на раённым, абласным і рэспубліканскім узроўнях, а ў 1954–1957, 1967, 1977, 1987 гг. прадстаўляў свае поспехі на ВДНГ у Маскве. За добрасумленную працу многія з кіраўнікоў, жывёлаводаў, механізатараў, паляводаў і іншых работнікаў былі адзначаны вышэйшымі дзяржаўнымі ўзнагародамі СССР: ордэнамі Леніна (1 чалавек), Кастрычніцкай Рэвалюцыі (2), Працоўнага Чырвонага Сцяга (9), Працоўнай Славы (4), Знак Пашаны (15), медалямі. Так, на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку ў Маскву ў 1954 г. ад калгаса «Сцяг камунізму» ездзілі старшыня калгаса Пётр Паўлікаў, аграном Мікалай Кавернікаў, перадавікі вытворчасці – даярка Соф’я Машлякевіч, свінарка Яўгенія Канапліцкая і інш. Даярка Соф’я Машлякевіч атрымала два залатыя медалі ВДНГ. У 1958 г. яна была ўзнагароджана ордэнам Леніна.

Нягледзячы на поспехі, матэрыяльнае стымуляванне працы калгаснікаў было слабым: звычайна ў канцы года яны атрымлівалі за працадні плату натурай. У час «хрушчоўскай адлігі» пачалося абмежаванне прысядзібнай гаспадаркі калгасных сялян. *«В колхозе нужно иметь 2 000 голов крупного рогатого скота, а каждый колхозник должен иметь одну корову,* – заяўлялася на адным з партыйным сходаў у 1956 г. – *Колхозники имеют по 2–3 головы коров… колхозный скот нет где пасти, потому что скот индивидуальных хозяйств преобладает»* [20, арк. 22адв.].

У 1957 г. ад калгасаў запатрабавалі строга захоўваць статуты сельскагаспадарчай арцелі. На сходзе раённага партыйнага актыву «прэтэнзіі» прад’явілі і да рубельскага калгаса. *«У большасці сельгасарцеляў многія калгаснікі мелі ў асабістым карыстанні па 2 каровы, а некаторыя нават па 3, 5, 7 галоў буйной рагатай жывёлы. У калгасе "Сцяг камунізму" справа дайшла да таго, што асобныя з іх сталі абзаводзіцца коньмі… У калгасе "Сцяг камунізму" пры ўнясенні змен у Статут сельгасарцелі не прадугледзелі скліканне агульных сходаў калгаснікаў. Усе пытанні калгаснага жыцця рашаюць упаўнаважаныя… Замест належнага выхавання калгаснікаў кіраўнікі калгаса "Сцяг камунізму" ўвялі заганны метад адміністравання і незаконнае штрафаванне»* [21, с. 2]. Змены і дапаўненні да Статута калгаса былі прыняты на агульным сходзе калгаснікаў 29 снежня 1957 г. Былі ўстаноўлены памеры прысядзібных участкаў: 0,3 га для сем’яў, што выпрацавалі мінімум працадзён, калі не выпрацоўвалі, то аб-

мяжоўвалі толькі 0,15 га. Калгаснікам дазвалялася мець толькі адну карову з прыплодам, адну свінаматку з прыплодам, усяго да 5 авечак і коз. Лішнюю жывёлу трэба было неадкладна абагуліць і атрымаць за яе грошы па цэнах дзяржзакупак [22, арк. 11].

Адбывалася ссяленне хутароў. У Рубельскім сельсавеце ў 1957 г. патрабавалася выселіць з хутароў 93 двары [23, арк. 27], найперш з Ямнішча, Бераставога, Борак. Увесь працэс ссялення хутароў меркавалася завяршыць да 1959 г. Перасяленцы атрымоўвалі пэўныя ільготы: на 3 гады іх вызвалялі ад выплаты сельскагаспадарчага падатку, паставак дзяржаве бульбы, прадуктаў жывёлагадоўлі, акрамя малака, давалі лесаматэрыял, выдзялялі пазыку. Аднак ссяленне хутароў ішло павольна. У сярэдзіне 1957 г. у Давыд-Гарадоцкім раёне было перасялена толькі 240 двароў (24 % ад гадавога плану). *«При сселении допускаются серьезные ошибки, не всегда переселяющийся может получить транспортные средства и тягловую силу для перевозки своего дома с хутора»* [24, арк. 297–298]. Вясной 1963 г. у калгасе «Сцяг камунізму» яшчэ заставаліся 20 хутарскіх двароў, аднак да канца лета перасялілі толькі дзве гаспадаркі. *«Многие дома колхозников требуют капитального ремонта при переноске жилых домов, но фонда лесоматериала не имеется, и мы не можем начать эту работу»,* – засведчылі ў Рубельскім сельсавеце і звярнуліся за дапамогай да раённых уладаў [25, арк. 11, 39–40]. Ссяленне з хутароў улады тлумачылі патрэбамі абагульнення зямлі, жывёлы, інвентару ў калгасах, неабходнасцю далучэння да лепшага, больш уладкаванага жыцця. Аднак з ліквідацыяй гэтага тыпу традыцыйных паселішчаў (хутароў) згубілася іх этнакультурная асаблівасць.

Калектывізацыя паспрыяла сацыяльнакультурнаму будаўніцтву ў сельскай мясцовасці: разгарнулася ліквідацыя непісьменнасці, перайшлі да 7-гадовай адукацыі, праводзілася электрыфікацыя, радыёфікацыя, дарожнае будаўніцтва, налажвалася медыцынскае і бытавое абслугоўванне, стваралася сетка культурна-асветніцкіх устаноў (хатаўчытальняў, клубаў). Была распачата меліярацыя беларускага Палесся, ажыццяўлялася механізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці і інш.

У студзені 1953 г. быў узведзены двухпавярховы будынак Рубельскай сярэдняй школы на 500 вучняў. Першы выпуск Рубельскай сярэдняй школы адбыўся ў 1955 г. У 1956 г. у Рублі быў адкрыты клуб з глядзельнай залай на 600 месцаў. На паштовае адзяленне прыходзіла 1 100 газет і часопісаў па падпісцы. Была праведзена электрыфікацыя і радыёфікацыя калгасных вёсак, створаны радыёвузел. Працавалі пяць крамаў у Рублі і адна ў Хотамлі, закусачная і хлебапякарня, дзейнічала піларама, млын. Калгас пераўтвараўся ў шматгаліновую калектыўную гаспадарку. У красавіку 1958 г. была адкрыта Рубельская ўчастковая бальніца на 25 месцаў.

**Гаспадарчае жыццё ў 1960–1980-я гг. Сучасны перыяд**

Пасля Гаўрыіла Платонавіча Бойкі, які быў кіраўніком гаспадаркі ў 1957–59 гг., у ліпені 1959 г. старшынёй калгаса «Сцяг камунізму» быў зацверджаны Васіль Барысавіч Бялко (1923 г. н., беларус, член КПСС, меў сярэднюю адукацыю). Распачатая ў канцы 1950-х гг. меліярацыя дазволіла пашырыць ворыўныя землі і культурныя пашы, якія далі магчымасць значна павялічыць вытворчасць малака і мяса. У калгасе працягвалася паляпшэнне пагалоўя статку, механізацыя жывёлагадоўлі. Для павышэння надояў малака дойны статак у пашавы перыяд пераводзілі ў лагеры, для яго ствараўся г. зв. зялёны канвеер, які дазваляў падкормліваць кароў да глыбокай восені.

У 1959 г. баланс ворных зямель калгаса папоўнілі першыя 150 га асушаных тарфянікаў. Асушаныя балоты пераўтвараліся ў высокаўрадлівыя землі, дзе збіраліся добрыя ўраджаі збожжавых і прапашных культур. Частка асушаных балотных зямель стала залужвацца для стварэння шматгадовай культурнай пашы – яе засявалі цімафееўкай, канюшынай ці іншымі травамі [26, с. 3]. За кошт асвоеных тарфянікаў умацоўвалася кармавая база калгаса.

Нягледзячы на ўсе недахопы тагачаснай меліярацыі, у першыя гады новыя землі давалі высокія ўраджаі. У засушлівы 1963 г. на тарфяніках былі атрыманы добрыя ўраджаі: бульбы – па 200–220 ц з гектара, карняплодаў цукровых буракоў – па 300 ц з гектара, высокаўраджайнымі былі пасевы льну.

У час «хрушчоўскай адлігі» адной з праяў валюнтарызму была адмова ад травапольнай сістэмы землекарыстання быццам на карысць больш прагрэсіўнай прапашной. Гэта азначала, што замест пасеваў шматгадовай травы трэба было разворваць лугі і засяваць іх кукурузай («царыцай палёў») ці іншымі культурамі. Гэтае разворванне лугоў пагражала развіццю жывёлагадоўлі ў рубельскім калгасе, бо ў немалой ступені за кошт тарфянікаў гаспадарка з году ў год павялічвала вытворчасць прадуктаў жывёлагадоўлі, зніжала сабекошт прадукцыі. Калі зверху паступіў загад пераараць сеяныя травы, то цэлы год В. Бялко ўдавалася неяк адмаўляцца ад гэтага, але ў 1963 г. пасля чарговай нарады прыйшлося здацца: усе травы перааралі, пасеялі прапашныя культуры на корм [27, с. 3]. Аднак выйгрышу ад гэтага не было, а, наадварот, павысіўся сабекошт малака, знізілася яго валавая вытворчасць.

Меліярацыя праводзілася павольна. Да 1965 г. забалочанасць зямель калгаса дасягала яшчэ 80 % [28, арк. 98]. Землі асушаліся адкрытай сеткай з разлікам на скідванне вады праз равы ў р. Гарынь. Аднак у засушлівы год вада поўнасцю выходзіла з глебы, у звычайны год летам назіраўся востры дэфіцыт вільгаці ў глебе, у дажджлівы год, пасля паводак, гэтыя землі доўга знаходзіліся пад вадой.

Тэмпы меліярацыі беларускага Палесся павялічыліся пасля майскага (1965 г.) Пленума ЦК КПСС. Меліярацыя зямель на Палессі была абʼяўлена Усесаюзнай ударнай камсамольскай будоўляй. З 1970-х гг. схема асушэння і асваення зямель Палескай нізіны была відазменена з улікам дапушчаных раней пралікаў. У ходзе выканання комплекснага асваення зямель беларускага Палесся ў 1976–1980-я гг. меркавалася пераўтварыць гэтыя землі ў зону высокапрадуктыўнай мяса-малочнай жывёлагадоўлі.

У 1967 г. з дапамогай магутнай меліярацыйнай тэхнікі пачаўся чарговы этап у асушэнні балотаў у калгасе «Сцяг камунізму»: да 1970 г. калгасу ўдалося павялічыць плошчу ворнай зямлі на 320 га. Назіраўся рост вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі і яе рэалізацыі, асабліва ў раслінаводстве. За 1966–1970 гг. у 2 разы ўзрасла валавая вытворчасць збожжа і склала 1 528 т. Адбыўся і рост ураджайнасці збожжавых: асобныя ўчасткі азімай пшаніцы і ячменю давалі па 35–40 ц з гектара. Рэзервам для далейшага павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі старшыня калгаса В. Бялко лічыў рацыянальнае выкарыстанне тарфяна-балотных глебаў [29, с. 3]. Зыходзячы з мясцовых кліматычных умоў, асаблівасцей глебаў, з кармавых культур найбольш каштоўнымі зʼяўляліся збожжавыя (авёс, ячмень), бульба, буракі, морква, кукуруза, лубін, канюшына, цімафееўка і інш. Да 1975 г. дзяржава перадала калгасу 2 тыс. 308 га меліяраваных зямель [28, арк. 101]. Паспяхова развівалася льнаводства. Па выніках працы 1967 г. брыгада Антона Іванавіча Гляда, звяно Надзеі Рыгораўны Каляды ўдзельнічалі ў ВДНГ у Маскве. Удзельнічала ў выстаўцы на ВДНГ звеннявая-льнавод Анастасія Андрэеўна Агіевіч.

У ходзе разгорнутай у краіне ў 1965 г. эканамічнай рэформы прадпрыемствы і калгасы пераводзіліся на гаспадарчы разлік. У калгасе «Сцяг камунізму» першай перайшла на гаспадарчы разлік агародная брыгада, а потым і ўсе астатнія. Пры высокім сабекошце кармавой адзінкі рэнтабельнасць жывёлагадоўлі была нізкай.

Па асноўных паказчыках сельскагаспадарчай вытворчасці калгас «Сцяг камунізму» да сярэдзіны 1970-х гг. пераўзыходзіў сярэднерэспубліканскія паказчыкі, хоць ужо не быў сярод лідараў. Так, у 9-й пяцігодцы (1971–1975 гг.) у параўнанні з 8-й (1966–1970 гг.) вытворчасць валавай прадукцыі ў калгасе вырасла на 23 %, асабліва павялічыўся валавы збор збожжавых, вытворчасць мяса. Ураджайнасць збожжавых культур павялічылася з 16,3 да 26,3 ц з гектара [30, арк. 14]. У 1976 г. ураджайнасць збожжавых ужо складала 30,7 ц з гектара (гэта было менш, чым у перадавых на той час калгасах Столінскага раёна – калгасе імя Леніна (Бяражное) – 34,1 ц з гектара і «За Радзіму» – 39,5 ц з гектара); бульбы – 161,3 ц з гектара, кармавых карняплодаў – 348 ц з гектара. Жывёлагадоўля тады аказалася стратнай з-за слабай укормленасці рэалізаванай жывёлы.

Мірная, стваральная праца калгаснікаў была азмрочана трагедыяй 12 чэрвеня 1963 г. на паромнай пераправе на р. Рубельскай, калі загінулі 10 чалавек (сем жанчын і трое дзяцей), якія накіроўваліся на праполку лёну. Грубыя парушэнні пры вырабе і эксплуата-

цыі парома, халатныя адносіны кіраўнікоў і спецыялістаў, ігнараванне тэхнікі бяспекі, уласная бяспечнасць людзей – усё разам прывяло да той трагедыі.

З 3 кастрычніка 1976 г. новым старшынёй калгаса «Сцяг камунізму» стаў Мікалай Пятровіч Ярмоліч (1942 г. н.). Ён выкарыстоўваў вопыт перадавых гаспадарак Брэстчыны, у прыватнасці калгаса «Аснежыцкі», які ўзначальваў двойчы Герой Сацыялістычнай Працы Уладзімір Антонавіч Ралько. Кіраўніцтва калгаса «Сцяг камунізму» вырашыла праводзіць сістэматычную і мэтанакіраваную працу па карэнным паляпшэнні зямлі, яе ўрадлівасці, і асаблівую ўвагу патрэбна было надаваць угнаенню глебы. У жывёлагадоўлі патрабавалася паляпшаць племянныя і прадуктыўныя якасці жывёлы. З дапамогай дзяржавы і ўласнымі сіламі працягвалася асушэнне забалочаных зямель, стварэнне там культурнай пашы. Калі М. Ярмоліч стаў старшынёй калгаса, то гаспадарка мела 2,5 млн руб. запазычанасці Дзяржбанку. Магчымасці паляпшэння пазіцый калгаса ён бачыў у рацыянальным выкарыстанні ўнутраных рэзерваў. Менавіта ў 1976 г. упершыню за апошнія тры гады быў атрыманы прыбытак – 70,7 тыс. руб. [32, арк. 11–12]. У 1977 г. калгас «Сцяг камунізму» быў ізноў прадстаўлены на ВДНГ у Маскве, а ў 1987 г. стаў пераможцам рэспубліканскага спаборніцтва за паспяховае выкананне Харчовай праграмы.

У 1978 г. ураджайнасць збожжавых у калгасе склала 37,7, бульбы – 208, кармавых карняплодаў – 620 ц з гектара, а надоі малака дасягнулі 4 тыс. л ад каровы [33, арк. 42].

У 1984 г. з аднаго гектара меліяраваных зямель у пераліку на кармавыя адзінкі было атрымана больш за 48,8 ц з гектара, а ў трэцяй брыгадзе – па 53,4 ц з гектара. Усяго ў калгасе было сабрана па 32 ц збожжавых з гектара [34, арк. 98–99]. Калгас выконваў планы па вытворчасці і продажы дзяржаве мяса, малака, ільносемені і інш.

У 10-й пяцігодцы (1976–1980 гг.) рубельскі калгас спецыялізаваўся па вытворчасці малака, гадаванні племянных цялушак. Былі перабудаваны старыя і пабудаваны новыя памяшканні для малочнага статку і адкорму маладняку, узводзіўся комплекс на 600 галоў. У раслінаводстве калгас спецыялізаваўся на вытворчасці ільновалакна, вырошчванні гародніны. Пры вырошчванні лёну ўкараняліся новыя прагрэсіўныя тэхналогіі. Таксама рабіўся акцэнт на вырошчванні кукурузы на корм [32, арк. 15].

Не чакаючы чарговай вялікай меліярацыі, у калгасе праводзілі працу па частковай абароне зямель (больш за 3 тыс. га) ад затаплення паводак сярэдняга ўзроўню. Удалося абараніць ад затаплення паўднёвую частку калгасных зямель (больш за 1 тыс. га). Аднак гаспадарка працягвала цярпець ад паводак: восенню 1974 г. і асабліва падчас вялікай паводкі ў сакавіку – красавіку 1979 г. (апошняя вялікая паводка была ў сакавіку 1999 г.). У пачатку 1980-х гг. пайшлі на паразалужэнне асобных зямель [34, арк. 102]. У 1985 г. калгас меў 2 308 га зямель, якія раней былі балотамі.

Адбывалася далейшае добраўпарадкаванне на тэрыторыі Рубельскага сельсавета. У лістападзе 1978 г. быў уведзены ў эксплуатацыю трохпавярховы будынак Рубельскай сярэдняй школы на 1 176 вучняў.

З сярэдзіны 1980-х гг. больш увагі было звернута на арганізацыю адпачынку калгаснікаў і моладзі. Сельскі дом культуры наладжваў такія святы, як Провады зімы, 8 Сакавіка, Свята песні і працы, абрад Купалля, праводзіў вечары адпачынку моладзі і работнікаў калгаса. Рубельскі сельсавет праводзіў працу па добраўпарадкаванні, паляпшэнні санітарнага стану вёсак. У пачатку 1986 г. быў створаны культурна-спартыўны комплекс, які ўключаў Рубельскі сельскі дом культуры, Хотамельскі сельскі клуб, савет фізкультурнікаў і інш. Папулярнасцю не толькі сярод аднавяскоўцаў, але і ва ўсім Столінскім раёне карыстаўся да 1990-х гг. мясцовы ВІА «Верныя сябры». На тэрыторыі сельсавета працавалі 3 бібліятэкі, у тым ліку адна дзіцячая, пры якой з 1989 г. дзейнічаў лялечны тэатр «Сонейка» [35, арк. 39]. У 1989 г. у в. Хотамель была адкрыта сярэдняя школа.

Мясцовыя каманды па валейболе і футболе пастаянна займалі прызавыя месцы. У калгасе назаўжды застаўся кубак па футболе на прыз «Залатая восень». У вёсцы працаваў філіял Давыд-Гарадоцкай спартыўнай школы. Асаблівае развіццё атрымала веславанне на байдарках і каноэ. Рубельскія выхаванцы прымалі актыўны ўдзел у спартыўных мерапрыемствах абласнога, рэспубліканскага і ўсесаюзнага ўзроўняў, атрымліваючы розныя ўзнагароды.

Разам з тым абсалютызацыя інтарэсаў калгаса і ігнараванне асабістых інтарэсаў яго работнікаў прывялі летам 1989 г. да забастоўкі калгаснікаў, у выніку якой старшыня калгаса М. Ярмоліч быў вымушаны пакінуць гаспадарку. У ліпені 1989 г. калгас «Сцяг камунізму» ўзначаліў Вячаслаў Іванавіч Нагар (1942 г. н.). З 1 студзеня 1990 г. калгас быў пераведзены на поўны ўнутрыгаспадарчы разлік. Атрымалі развіццё розныя формы падраду, пачалі стварацца спецыялізаваныя кааператывы.

Вяскоўцы ў сваіх прысядзібных гаспадарках традыцыйна трымалі кароў, ад якіх здавалі малако, гадавалі цялят, свіней. У 1950–80-я гг. працаздольнае насельніцтва шматлюднай вёскі Рубель не было забяспечана працай. Напрыклад, у пачатку 1990-х гг. у Рубельскім сельсавеце пастаяннае месца працы мелі толькі каля чвэрці жыхароў. На працягу многіх дзесяцігоддзяў штогод выязджала з вёскі не менш за тысячу працаздольных дарослых на сезонныя работы ў розныя рэгіёны СССР («на цаліну», «у Сібір»). Мужчыны займаліся там пераважна будаўніцтвам і рамонтам, жанчыны – апрацоўкай і ўборкай сельскагаспадарчых культур. З заработкаў прывозілі грошы, а таксама зерне, сена, будаўнічыя матэрыялы, запчасткі і інш. Некаторыя з вяскоўцаў вырошчвалі насенне кветак, гародніны для іх далейшага продажу («ездзілі на вя́сну»). Пасля выхаду пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па ўзмацненні барацьбы з непрацоўнымі даходамі» ад 15 мая 1986 г. парткам калгаса распрацаваў свой адпаведны план мерапрыемстваў: *«Постоянно выявлять факты выезда граждан торговать семенами цветочных и овощных культур, факты имевшие место, обсуждать в трудовых коллективах. Привлекать к административной ответственности лиц, допускающих нарушение законодательства, а также постановления советских органов. Давать принципиальную оценку руководителям, покрывающим выезд граждан на торговлю семенами без разрешения и соответствующих документов»* [33, арк. 82–83].

Акрамя працаўладкавання, у в. Рубель востра адчуваўся недахоп зямлі, кармоў для буйной рагатай жывёлы мясцовых жыхароў (мала было сенакосаў), паліва (торфу, дроў), дзелавой драўніны для забудовы. Перанаселенасць паўплывала на адток моладзі з 1970-х гг. на вучобу ці месцажыхарства, працоўную дзейнасць у розныя рэгіёны Беларусі і за яе межы.

З прыходам новага старшыні калгаса В. Нагара было знята напружанне з сенакосамі для насельніцтва, бо раней яны былі вельмі абмежаваны з-за наяўнасці шматлікага пагалоўя жывёлы ў калгасе. Як адзначалася ў сельсавеце, калгас павялічваў пагалоўе жывёл *«с каждым годом “бездумно”, потому что это выгодно было государству, но не людям»* [36, арк. 57]. У пачатку 1993 г. патрабавалася 2 тыс. т сена для грамадскага статку і 4 тыс. т для жывёлы жыхароў [37, с. 1–2].

У час старшынства В. Нагара для вырашэння пытання аб працаўладкаванні людзей былі адкрыты пабочныя вытворчасці: цэх па вырабе шлакаблокаў, звераферма, сажалкі, пасекі, наладжана пляценне мэблі з лазы, пабудаваны льнозавод і інш. Былі пашыраны ў калгасе пасевы лёну да 120 га (далейшае павелічэнне плошчаў было немагчыма з-за недахопу зямлі). Адкрыты восенню 1992 г. ільнозавод, што перапрацоўваў ільнотрасту, акупіўся за адзін сезон і даў прыбытак, яго рэнтабельнасць складала 100 %. Дырэктарам ільнозавода стаў былы галоўны аграном, намеснік старшыні калгаса Васіль Аляксандравіч Пашкевіч. На дадатковых вытворчасцях у калгасе было створана да 300 новых працоўных месцаў.

З 1992 г. была праведзена зямельная рэформа. Для яе ажыццяўлення для Рубельскага сельсавета было перададзена 3 028 га зямлі, у т. л. 493 га ворыва, 630 га сенажацяў, 1 235 га пашы і 350 га для прысядзібных участкаў. Калі да зямельнай рэформы ў карыстанні кожнага сялянскага двара было 0,31 га зямлі, то ў выніку яе сумарная плошча дасягнула 0,5 га [38, арк. 3]. Наогул В. Нагар быў прыхільнікам адраджэння сялянскай гаспадарлівасці [39, с. 2]. Як бачым, ва ўмовах перанаселенасці і абмежаванасці зямельнага фонду ў рубельскай гаспадарцы пайшлі не па шляху развіцця фермерства, а паводле прынцыпу сацыяльнай справядлівасці раўнамерна размеркавалі зямлю паміж сялянскімі дварамі.

У снежні 1996 г. калгас узначаліў Васіль Аляксандравіч Пашкевіч (1954 г. н.). У 1997 г. рост вытворчасці сельскагаспадарчай вытворчасці складаў 33 %, рэнтабельнасць – 13 % [40, с. 3].

У 2002 г. калгас «Рубельскі» быў рэарганізаваны ў сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Рубельскі». У 2004–2007 гг. і з 2015 г. ім кіруе Аляксандр Іванавіч Ляшкевіч (у 2007–2015 гг. кіраўніком гаспадаркі быў Віктар Васільевіч Дзяніскавец). З 25 снежня 2006 г. Рубель стаў аграгарадком.

Чарнобыльская аварыя 1986 г., распад Савецкага Саюза, станаўленне Рэспублікі Беларусь, эканамічны крызіс і пашырэнне рынкавых адносін аказалі ўплыў і на ўклад жыцця рубельцаў.

Пасля правядзення зямельнай рэформы спачатку вяскоўцы сеялі збожжавыя культуры, потым сталі вырошчваць гародніну (моркву, капусту, сталовыя буракі), а ў парніках – агуркі. Рэзка павялічылася (да 700–900) у жыхароў Рубельскага сельсавета пагалоўе коней, а таксама буйной рагатай жывёлы (з 1,3 да 1,5 тыс.), свіней (з 2,8 тыс. да 3,5 тыс., з іх больш за 1 тыс. свінаматкі) [41, с. 2].

Адбывалася паляпшэнне транспартнай інфраструктуры, аб’ектаў сацыяльнай сферы. У снежні 1996 г. у в. Рубель быў пабудаваны мост, а ў кастрычніку 2001 г. адкрыты пантонны мост на р. Гарынь на дарозе Рубель – Беражное. Узведзеныя дамбы цяпер ужо дазваляюць засцерагчы вёску ад затаплення.

У красавіку 2015 г. у Рублі быў адкрыты дзіцячы сад № 2, у чэрвені 2018 г. у аграгарадку Рубель адбыўся ўрачысты пуск прыроднага газу.

Аднак фінансавае становішча КСУП «Рубельскі» стала крытычным. На дапамогу ў 2019 г. прыйшла фермерская гаспадарка «Опыт КАА» А. А. Копца.

**Заключэнне**

Самаадданай працай людзей у першыя пасляваенныя гады была адноўлена в. Рубель, спаленая германскімі нацысцкімі акупантамі ў 1944 г. Сяляне-аднаасобнікі былі абкладзены рознымі дзяржаўнымі падаткамі, выконвалі лесанарыхтоўкі і інш. Прыватнаўласніцкія інтарэсы сялян стрымлівалі працэс калектывізацыі. Аднак створаны ў 1948 г. мясцовы калгас паступова ператварыўся ў 1950-я гг. у адзін з перадавых у раёне і вобласці. Калектывізацыя паспрыяла сацыяльна-культурнаму будаўніцтву ў вёсцы. У ходзе праведзенай меліярацыі балоты пераўтвараліся ў высокаўрадлівыя землі, была створана культурная паша.

У 1960–1980-я гг. калгас «Сцяг камунізму» – гэта ўжо шматгаліновая гаспадарка. Яна прайшла шлях ад сельскагаспадарчай арцелі да сельскагаспадарчага вытворчага кааператыву, калектыўнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства. У розны час кіравалі гэтай гаспадаркай А. П. Разановіч (1948–1950), П. А. Паўлікаў (1950–1957), Г. П. Бойка (1957–1959), В. Б. Бялко (1959–1976), М. П. Ярмоліч (1976–1989), В. І. Нагар (1989–1996), В. А. Пашкевіч (1996–2004), В. В. Дзяніскавец (2007–2015), А. І. Ляшкевіч (2004–2007, з 2015).

Аднак шэраг пытанняў, сярод якіх працаўладкаванне дарослага насельніцтва, слабае забеспячэнне палівам, пашай і кармамі для хатняй жывёлы і інш., на працягу дзесяцігоддзяў не атрымлівалі станоўчага вырашэння ва ўмовах перанаселенасці, ігнараванне інтарэсаў жыхароў прысядзібных гаспадарак на карысць калгаснай вытворчасці. Частка вяскоўцаў вымушана была часова выбываць на сезонныя будаўнічыя і сельскагаспадарчыя работы, некаторыя (асабліва моладзь) выязджалі з 1970-х гг. на вучобу ці на пастаяннае жыхарства ў розныя рэгіёны Савецкага Саюза. Да вырашэння праблемы занятасці больш сур’ёзна падышлі ў пачатку 1990-х гг. У ходзе зямельнай рэформы адбылося раўнамернае размеркаванне зямлі паміж сялянскімі дварамі паводле прынцыпу сацыяльнай справядлівасці.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Вабищевич, А. Н. Рубельский православный приход на Столинщине (конец XVIII – начало XX в.) / А. Н. Вабищевич // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2018. – № 1. – С. 17–27.

2. Вабищевич, А. Н. Рубельский православный приход на Столинщине (1920-е гг. – начало XXI в.) / А. Н. Вабищевич // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2020. – № 1. – С. 5–17.

3. Вабішчэвіч, А. Рубель / А. Вабішчэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1993–2003. – Т. 6 : у 2 кн. – Кн. 1. – 2001. – С. 124.
4. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Столінскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – 635 с.
5. Занальны дзяржаўны архіў у г. Пінску (ЗДАП). – Ф. 118. Воп. 1. Спр. 44а.
6. ЗДАП. – Ф. 936. Воп. 1. Спр. 10.
7. ЗДАП. – Ф. 936. Воп. 1. Спр. 1.
8. Летапіс Рубельскай Свята-Міхайлаўскай царквы : рукапіс.
9. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр). – Ф. 2220-п. Воп. 1. Спр. 72.
10. ДАБр. – Ф. 2220-п. Воп. 1. Спр. 94.
11. ДАБр. – Ф. 2220-п. Воп. 15. Спр. 274.
12. ДАБр. – Ф. 2220-п. Воп. 15. Спр. 276.
13. Чырвоны сцяг. – 1951. – 10 чэрв.
14. ДАБр. – Ф. 2220-п. Воп. 1. Спр. 122.
15. Чырвоны сцяг. – 1956. – 19 кастр.
16. Сцяг Леніна. – 1958. – 6 жніўня.
17. Чырвоны сцяг. – 1952. – 17 жніўня.
18. Чырвоны сцяг. – 1951. – 7 чэрв.
19. Чырвоны сцяг. – 1952. – 7 лют.
20. ДАБр. – Ф. 2228-п. Воп. 56. Спр. 1313.
21. Сцяг Леніна. – 1957. – 4 верас.
22. ЗДАП. – Ф. 105. Воп. 1. Спр. 1а.
23. ЗДАП. – Ф. 936. Воп. 1. Спр. 65.
24. ДАБр. – Ф. 2220-п. Воп. 1. Спр. 201.
25. ЗДАП. – Ф. 936. Воп. 1. Спр. 96.
26. Сцяг Леніна. – 1960. – 19 кастр.
27. Навіны Палесся. – 1965. – 11 мая.
28. ДАБр. – Ф. 2228-п. Воп. 56. Спр. 1348.
29. Навіны Палесся. – 1970. – 22 снеж.
30. ДАБр. – Ф. 2228-п. Воп. 56. Спр. 1336.
31. ЗДАП. – Ф. 105. Воп. 1. Спр. 120.
32. ДАБр. – Ф. 2228-п. Воп. 56. Спр. 1337.
33. ДАБр. – Ф. 2228-п. Воп. 56. Спр. 1350.
34. ДАБр. – Ф. 2228-п. Воп. 56. Спр. 1348.
35. ЗДАП. – Ф. 936. Воп. 1. Спр. 307.
36. ЗДАП. – Ф. 936. Воп. 1. Спр. 312.
37. Навіны Палесся. – 1993. – 24 лют.
38. ЗДАП. – Ф. 936. Воп. 1. Спр. 316.
39. Заря. – 1990. – 21 сент.
40. Навіны Палесся. – 1998. – 25 лют.
41. Навіны Палесся. – 1999. – 11 снеж.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 09.11.2020*